УДК 373.5.016:821.161.3

**Т.М. Пучынская**
(Баранавічы, Беларусь)

# ВЫВУЧЭННЕ ТВОРЧАСЦІ МІХАСЯ СТРАЛЬЦОВА Ў ШКОЛЕ: КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫ АСПЕКТ

*У артыкуле на аснове актуалізацыі культуралагічнага кампанента адукацыі раскрываецца метадычная праблема вывучэння ў XI класе манаграфічнай тэмы «Міхась Стральцоў». На прыкладзе аналізу праграмнага апавядання «Сена на асфальце» паказваюцца напрамкі працы з сэнсавымі дамінантамі ў тэксце – горад і вёска. Значная ўвага надаецца пытанню ўспрымання сучаснымі вучнямі класічных твораў беларускай літаратуры, методыцы вядзення вучэбнага дыялогу.*

Культуралагічны кампанент адукацыі спрыяе развіццю ў вучняў якасцей і ўменняў, неабходных для міжасабовага ўзаемадзеяння ў сучасным полікультурным свеце. Таму вывучэнне літаратуры на аснове культуралагічнага падыходу з'яўляецца актуальным напрамкам сучаснай школьнай адукацыі. «Мастацтва як пазнанне» (Л.С. Выгоцкі) раскрывае перад чалавекам разнастайныя сэнсы жыцця, у гэтым і заключаецца каштоўнасць літаратуры як мастацтва слова. Знаёмства з праграмнымі творамі дапамагае фарміраваць у школьнікаў уяўленне пра значнасць нацыянальнай літаратуры ў кантэксце агульначалавечай культуры, стварае ўмовы для самавызначэння асобы вучня.

Навучанне літаратуры ў культуралагічным аспекце дазваляе паглыбіць інтэграцыю адукацыйнага працэсу, далучыць школьнікаў да «бесперапыннага дыялогу быцця» (В.А. Дамански). На ўроках з выкарыстаннем культуралагічнага аналізу асабліва значным з'яўляецца ўстанаўленне міжтэкставага ўзаемадзеяння, аналіз нацыянальнай літаратуры ў цесных генетычных, кантактных і тыпалагічных сувязях. Культуралагічныя тэндэнцыі ў выкладанні вучэбнага прадмета выяўляюць такія прыёмы працы, як вызначэнне сувязі літаратуры з гісторыяй, мовай, літаратурнай крытыкай, іншымі відамі мастацтва. Надаць уроку культуралагічную накіраванасць дазваляе зварот да эстэтыкі, філасофіі, міфалогіі, вуснай народнай творчасці.

Неабходнасць устанаўлення пэўнага кантэксту ў працэсе вывучэння літаратуры не павінна быць строга вызначана. Яна ўзнікае ў сувязі з логікай развіцця ўрока і залежыць ад культурнага патэнцыялу ўдзельнікаў дыялогу. На выбар кантэксту вывучэння літаратурнага твора ўплывае таксама яго змест (мастацкія ідэі, вобразы, знакі, сімвалы), які неабходна інтэрпрэтаваць.

Творчасць Міхася Стральцова – вядомага празаіка, паэта, крытыка, перакладчыка – з'яўляецца каштоўным матэрыялам для літаратурнага развіцця старшакласнікаў. Для вывучэння ў XI класе праграмай прапануецца апавяданне «Сена на асфальце» [1, с. 32]. М. Стральцоў – гараджанін у першым пакаленні, гэты факт біяграфіі асабліва



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

паўплываў на яго творчасць. Пісьменнік імкнуўся па-мастацку асэнсаваць, як адчувае сябе чалавек, які змяніў вясковы лад жыцця на гарадскі.

Звяртаючыся да апавядання «Сена на асфальце», настаўнік арганізуе працу з сэнсавымі дамінантамі ў тэксце, блізкімі да культуралогіі, – горад і вёска. У якасці метадычнага аспекту правядзення ўрока літаратуры мэтазгодна выбраць вучэбны дыялог, які пашырыць культурны кругагляд вучняў. Пачаткам для вядзення дыялогу можа стаць «загадка» назвы апавядання – «Сена на асфальце».

Змест працы з тэкстам умоўна дзеліцца на наступныя сэнсава-тэматычныя групы: «горад», «вёска», «вёска ў горадзе». Сціслы культуралагічны каментарый пра горад як спецыфічны прасторавы асяродак дапамагае пашырыць дыяпазон успрымання вучнямі рэчаіснасці. Кароткі агляд урбаністычнай тэмы ў беларускай літаратуры на прыкладзе папярэдне вывучаных твораў М. Багдановіча, Н. Гілевіча актуалізуе міжтэкставае ўзаемадзеянне, спрыяе фарміраванню ўмення старшакласнікаў параўноўваць мастацкія тэксты.

Далей вучні аналізуюць вобраз горада ў апавяданні М. Стральцова, прыводзяць прыклады апісання вуліц, дамоў, жыхароў: «бледна мігала рэклама», «святочна апранутыя хлопцы і дзяўчаты», «пахла парфумай, газіроўкай і цыгарэтным дымам», «перапоўнены тралейбус», «кінатэатры на ўскраінах горада – старыя, са скрыпучымі лаўкамі, з вышараванай нагамі, выбітай да ямак падлогай», «вуліца пахла яшчэ і свежымі булкамі, і духмянай кавай, і цвярозлівым халадком маладой зялёнай лістоты», «у нечай кватэры задумліва вяла ціхую мелодыю радыёла» і інш. [2, с. 73–88]. Варта звярнуць увагу вучняў на тое, што М. Стральцоў апісвае горад у межах сваёй гістарычнай эпохі, культурныя рэаліі якой могуць не супадаць з сённяшнім днём.

Працяг дыялогу паміж настаўнікам і вучнямі будуецца на аснове знаходжання і каментавання цытат, у якіх паказаны каштоўнасныя арыентацыі, побыт, паводзіны гарадскіх жыхароў: «многа людзей вярталася ў горад – на матацыклах, матаролерах, у легкавушках», «у зале ўсчыналіся свіст, крык, не вельмі далікатныя жарты», «мужчыны сумавалі побач з імі: курылі, нізка ўгнуўшы плечы, пыхкаючы дымам сабе ў кулак», «сусед у мяне, бывала, нап’ецца, уключыць у пакоі прыёмнік на ўсю моц», «жонка ягоная лаецца», «нейкі таўставаты чалавек у піжаме паліваў са шланга газон з кветкамі» [2, с. 73–88]. Вучні падагульняюць свае назіранні над тэкстам і робяць вывад, што ў горадзе героі М. Стральцова часам адчуваюць сябе няўтульна. Разам з тым аўтар не адмаўляе каштоўнасць горада як спецыфічнага культурнага асяродку. Кінатэатр, кафэ, футбол, кіёскі з газетамі, сквер, заасфальтаваныя вуліцы, гаршкі з кветкамі на ліхтарных слупах, шырокія газоны – гарадскія рэаліі прывабліваюць чытача сваёй адметнай сучаснай прасторай.

На наступным этапе ўрока старшакласнікі знаходзяць у тэксце прыклады апісання карцін вясковага жыцця, вызначаюць іх сэнсавую і эмацыянальную дамінанту. Вучні аналізуюць лад жыцця, паводзіны, асаблівасці мыслення і свядомасці герояў, чыё жыццё праходзіла ў вёсцы. Школьнікі робяць наступнае падагульненне: вяртанне праз успаміны герояў, гараджан у першым пакаленні Віктара і дзядзькі Ігната, у вясковае мінулае афарбавана лёгкаю журбою, шкадаваннем па страчаным «зацішку, спакою».



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

На ўроку літаратуры ў старшых класах важна актуалізаваць гістарычны кантэкст эпохі. Кароткія звесткі, падрыхтаваныя старшакласнікамі на тэму пасляваеннага жыцця беларускай вёскі, паспрыяюць адчуванню вучнямі атмасферы часу. Старшакласнікі аналізуюць «Ліст другі», у якім Віктар, герой апавядання, успамінае першыя пасляваенныя гады. Школьнікі адзначаюць, што М. Стральцоў належыць да пакалення «дзяцей вайны», якія прайшлі праз галоднае дзяцінства, рана сталі «бязбацькавічамі». Таму так кранальна гучаць успаміны героя апавядання пра маці, якая плакала над пахавальным лістком па мужу: «Яна часта плакала ў той год: і раніцай, калі выпраўляла мяне ў школу, пачапіўшы палатняную торбачку з кніжкамі на маё плячо і даўшы ў рукі новенькую трохрублёўку на Чырвоны Крыж, і раніцай, калі не пускала мяне ў школу і я сядзеў цэлы дзень на печы, бо не было чаго абуць на ногі» [2, с. 80].

Кантэкст біяграфіі пісьменніка, як і гістарычны кантэкст эпохі, надае ўроку культуралагічную накіраванасць, дазваляе сфарміраваць у вучняў уяўленне пра тое, што М. Стральцоў з'яўляецца летапісцам пасляваеннага быцця не толькі сваіх аднавяскоўцаў, але і цэлага пакалення «дзяцей вайны».

Звяртаючыся да тэмы вёскі, гістарычных падзей у апавяданні М. Стральцова, настаўніку неабходна ўлічваць, што сучасныя школьнікі ў пераважнай большасці жывуць у горадзе. У апошнія дзесяцігоддзі істотна змянілася сацыякультурная сітуацыя, з'явіўся новы стыль мыслення, звязаны з урбанізацыяй, пераходам да лічбавых сродкаў камунікацыі. Таму вучням цяжка ўспрымаць культурнагістарычны фон твора, аддаленага ў часе. Школьнікі могуць мець агульнае ўяўленне пра асаблівасці вясковага побыту, ведаць гістарычныя факты, звязаныя з пасляваенным быццём вёскі, аднак чытаць пра гэта ў мастацкім тэксце ім складана. Карціны вясковага жыцця – мінулага і нават сучаснага – з цяжкасцю ўспрымаюцца вучнямі, паколькі старшакласнікі не могуць наглядна ўявіць адпаведныя мастацкія вобразы, убачыць асацыяцыі, правесці аналогіі з сённяшнім днём.

На практыцы вырашыць гэтую метадычную праблему дастаткова складана. Кожны настаўнік у канкрэтнай вучэбнай сітуацыі шукае свой шлях пераадолення дадзенай тэндэнцыі, спрабуе знайсці такія прыёмы працы, якія наблізяць класічны твор да досведу сучаснага школьніка. Магчыма, мэтазгодна часцей праводзіць традыцыйную слоўнікавую працу. Так, варта растлумачыць значэнне слоў «фінінспектар», «аратай», «ватоўка», «касавіца», «цяпельца», «таптуха», «трыножка», «куфар», «вакса», «самапал», «рэпрадуктар», якія сустракаюцца ў апавяданні М. Стральцова.

Карысна стымуляваць самастойны пошук вучнямі адказу на пастаўленыя пытанні, напрыклад, праз выкарыстанне інтэрнэт-рэсурсаў. Гэта можа выклікаць у старшакласнікаў большую цікавасць, чым гатовы адказ настаўніка. Варта прапанаваць вучням выступіць у ролі «экспертаў тэксту». Дома ў працэсе чытання яны знаходзяць тыя мастацкія вобразы, словы або выразы, якія ўскладняюць разуменне твора. Школьнікі тлумачаць значэнне «артэфактаў культуры», аддаленых у часе, прыводзяць прыклады іх выкарыстання ў іншым кантэксце, пры неабходнасці падбіраюць ілюстрацыі, малюнкі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

На наступным этапе ўрока вучні, працуючы ў парах, абмяркоўваюць пытанне: «Ці атрымалася ў герояў апавядання, былых вяскоўцаў, прымірыць у душы вёску і горад?». Аргументаванае меркаванне, выпрацаванае на аснове дыялогу, міжасабовага ўзаемадзеяння, вучні прадстаўляюць класу. Зварот да назвы апавядання «Сена на асфальце» падагульняе разважанні старшакласнікаў па тэме ўрока, вядзе да «разгадкі» назвы твора і асэнсавання яго мастацкай ідэі.

Адзін з аспектаў культуралагічнага падыходу да вывучэння літаратуры – раскрыццё ролі мастака ў гісторыі культуры, знаёмства вучняў з ацэнкай творчасці пісьменніка. Літаратуразнаўчы кантэкст дапамагае старшакласнікам абагуліць веды, узняцца на больш высокі ўзровень разумення творчасці пісьменніка. Таму на заключным этапе вывучэння манаграфічнай тэмы настаўнік знаёміць вучняў, напрыклад, з выказваннем акадэміка У. Гніламёдава: «Творчасць Міхася Стральцова – гэта вялікі падарунак беларускай літаратуры. Яна каштоўная не толькі для беларусаў, але і для ўсяго свету, таму што Міхась у сваёй творчасці расказваў пра Беларусь» [3]. Ацэнка творчасці пісьменніка, яго ролі ў літаратурным працэсе выкарыстоўваецца ў якасці вучэбнага матэрыялу на этапе рэфлексіі.

Такім чынам, урокі літаратуры, праведзеныя па методыцы вучэбнага дыялогу на аснове актуалізацыі культуралагічнага кампанента адукацыі, дапамагаюць старшакласнікам усвядоміць твор як эстэтычную з'яву пэўнай эпохі, ствараюць умовы для пашырэння іх культурнага кругагляду. Апавяданне М. Стральцова «Сена на асфальце» дае школьнікам магчымасць асэнсаваць мастацкае выяўленне феномена «горад» / «вёска», высветліць яго значэнне для кожнага з герояў апавядання, ідэнтыфікаваць сябе, вучня-чытача, у пэўнай сацыяльнай групе, убачыць у тэксце асобасны сэнс.

**Спіс літаратуры**

1. Беларуская мова. Беларуская літаратура. X–XI класы : вучэбныя праграмы для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2017. – 39 с.

2. Стральцоў, М. Ад маладзіка да поўні : апавяданні, аповесці, эсэ / М. Стральцоў. – Мінск : Маст. літ., 2005. – 430 с.

3. Чайкоўская, В. Міхась Стральцоў – пісьменнік, які адкрываў адносіны Беларусі са светам [Электронны рэсурс] / В. Чайкоўская // Звязда. – 2012. – 14 лютага. – Рэжым доступу: https://news.tut.by/culture/273948.html. – Дата доступу: 10.03.2019.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова